УДК 930.(476)

**_А.А. Савіч_**
_канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў_
_Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна_
e-mail: uleks@tut.by

# ГЕНДАРНЫЯ АСПЕКТЫ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг.

_Даследаванне накіравана на асэнсаванне гендарных паказчыкаў айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у другой палове 1950-х – 1980-я гг. Складанасцю асэнсавання тэмы з'яўляецца недастатковая колькасць эга-дакументальных крыніц навукова-гістарычнай супольнасці даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі, нязначная прэзентацыя гендарнай праблематыкі ў архіўных фондах. Нягледзячы на гэта, на падставе разнастайных крыніц (апублікаваных навуковых прац, аўтарэфератаў, рукапісаў дысертацый, архіўных матэрыялаў) выяўлена значэнне прафесійнага ўдзелу жанчынгісторыкаў у развіцці заходнебеларускай гістарыяграфіі. Адзначана дастаткова высокая ступень прысутнасці жанчын у навуковай супольнасці даследчыкаў заходнебеларускай гісторыі, іх высокая навуковая паспяховасць і публікатарская выніковасць. Аднак ва ўмовах савецкай уніфікацыі гістарычных даследаванняў у гісторыкаў-жанчын не было магчымасцей стварэння «жаночай» версіі вывучэння адпаведных праблем._

## Уводзіны

Вядома, што савецкая гістарычная навука, за нязначным выключэннем, характарызавалася дамінантным становішчам мужчын у ёй. У цэлым гэта тычылася і беларускай савецкай гістарыяграфіі, у тым ліку корпуса даследчыкаў, якія ў савецкі час займаліся вывучэннем гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. У айчыннай гістарычнай навуцы адсутнічаюць публікацыі, прадметна прысвечаныя асэнсаванню гендарных асаблівасцей развіцця гістарыяграфіі праблемы, аднак іх выяўленне і даследаванне забяспечыць стварэнне больш поўнай і аб'ектыўнай карціны станаўлення і развіцця навуковых ведаў па праблематыцы гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы.

Мэтай артыкула з'яўляецца выяўленне прысутнасці ў агульнай кадравай структуры беларускіх савецкіх даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. гісторыкаў-жанчын, устанаўленне іх навукова-тэматычных прыярытэтаў, эфектыўнасці, выніковасці і спецыфікі навукова-даследчыцкіх падыходаў, абумоўленых гендарна-палавымі асаблівасцямі.

## Удзел гісторыкаў-жанчын у распрацоўцы пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

У распрацоўцы заходнебеларускай праблематыкі прысутнасць жанчын стала бачнай ужо з пачатку 1930-х гг. Гэта можна патлумачыць як наступствам савецкай эмансіпацыі, калі жанчыны актыўна ўключыліся ў разнастайныя грамадска-палітычныя працэсы, у тым ліку ў рэвалюцыйную дзейнасць, так і тым, што падарваныя рэпрэсіямі пачатку 1930-х гг. кадры заходнебеларускай гістарыяграфіі трэба было тэрмінова ўзмацняць надзейнымі асобамі. Так, у гэты час назіраем у складзе Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Беларускай акадэміі навук у якасці выконваючай абавязкі К.С. Матулайціс (1933–1934 гг.) і старшыні камісіі Л.М. Янкоўскую (1934–1935 гг.), а таксама супрацоўнікаў названай установы Р.С. Віленскую, Я.М. Крымскую, Л.М. Майскую [1, с. 173, 181, 184, 192], у якіх уласных навуковых прац не выяўлена.

Значная прысутнасць гісторыкаў-жанчын з неабходнымі навуковымі атрыбутамі ў выглядзе навуковых публікацый, званняў і ступеняў стала характэрнай асаблівасцю айчыннай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у другой палове

1950-х – 1980-я гг. Так, сваё слова ў даследаванні заходнебеларускай праблематыкі пакінулі І.В. Царук, Т.Ю. Глінская, С.І. Наркевіч, С.В. Талапіна і Т.А. Гойдзь. Зыходзячы з інфармацыі У.М. Міхнюка адносна таго, што да 1988 г. па заходнебеларускай праблематыцы было абаронена 28 кандыдацкіх дысертацый [2, с. 19], «жаночы атрад» у супольцы вучоных – спецыялістаў па гісторыі Заходняй Беларусі склаўся 18 % ад агульнай колькасці гіторыкаў, што для таго часу з’яўляецца дастаткова высокім паказчыкам.

Амаль усе жанчыны-гісторыкі займаліся распрацоўкай характэрных для таго часу навуковых тэм. У прыватнасці, найбольш паспяховая з названых вучоных І.В. Царук у 1965 г. абараніла кандыдацкую, а ў 1975 г. доктарскую дысертацыі па актуальнай у той час гісторыка-партыйнай тэматыцы, стала аўтарам шматлікіх навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій [3–7]. Т.Ю. Глінская прадметна займалася галоўным на той час накірункам гісторыі Заходняй Беларусі – гісторыяй Кампартыі Заходняй Беларусі, абараніла кандыдацкую дысертацыю ў 1963 г., стала аўтарам шэрагу артыкулаў і дзвюх манаграфій [8–10]. Сярод гісторыкаў-жанчын неабходна адзначыць вучонага-эканамістa С.І. Наркевіч, якая адзіная ў Беларусі даследавала эканамічную гісторыю Заходняй Беларусі на ўзроўні кандыдацкай дысертацыі, абараніўшы яе ў 1965 г. Трэба канстатаваць высокі навукова-тэарэтычны ўзровень і грунтоўнае фактaлагічнае забеспячэнне дадзенага даследавання, якое, на жаль, не было апублікавана ў выглядзе асобнай манаграфіі; рукапіс жа дысертацыі ўяўляе і сёння навуковую каштоўнасць [11; 12]. Выдзяляецца сваёй прадметнай скіраванасцю на жаночую гісторыю кандыдацкае даследаванне і манаграфія С.В. Талапінай, прысвечаныя грамадска-палітычнай і публіцыстычнай дзейнасці В.З. Харужай, знакамітай рэвалюцыянеркі і падпольшчыцы, якой у 1960 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза [13; 14]. Т.А. Гойдзь (Лугачова) у якасці прадмета дысертацыйнага даследавання абрала дзейнасць на тэрыторыі Заходняй Беларусі Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), абараніла кандыдацкую дысертацыю, апублікавала вялікую колькасць навуковых прац, у тым ліку манаграфію [15; 16].

Эга-дакументальная спадчына айчынных гісторыкаў, якая дазваляе дастаткова пераканаўча выявіць гісторыка-антрапалагічныя акалічнасці функцыянавання гістарычнай навукі, і гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі ў прыватнасці, за малым выключэннем, амаль адсутнічае. Гэта тычыцца і абставін навуковай дзейнасці названых гісторыкаў-жанчын, за выключэннем І.В. Царук, мемуарныя выданні якой закранаюць некаторыя гістарычна-навуковыя аспекты яе асабістага жыцця, у тым ліку разам з сямейна-бытавымі цяжкасцямі, наяўнасцю істотнай падтрымкі роднага брата, аўтарытэтнага дзяржаўнага дзеяча БССР С.В. Прытыцкага, адлюстроўваюць спагадліва-добразычлівыя адносіны калег-мужчын [17; 18].

У гэтай сітуацыі прэтэндаваць на стварэнне дастаткова поўнай карціны гендарных асаблівасцей гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі не даводзіцца. Сітуацыя ўскладняецца і адсутнасцю архіўных дакументаў, якія раскрываюць гісторыка-антрапалагічныя, у тым ліку і гендарныя, паказчыкі гістарыяграфічнай сітуацыі. Таму вялікае значэнне маюць выяўленыя сярод іншых архіўныя дакументы, якія дазваляюць раскрыць пэўныя навукова-гендарныя паказчыкі, прыцягваюць увагу па прычыне несумненнай іх навуковай каштоўнасці. Гэта тычыцца звестак аб навуковадаследчыцкай дзейнасці выкладчыка БДУ Т.Ю. Глінскай, узаемаадносіны якой з калегамі характарызуюцца як неадназначныя. Асабліва гэта тычыцца яе прафесійных стасункаў з М.С. Арэхвам – былым членам цэнтральнага кіраўніцтва КПЗБ, аўтарытэтным знаўцам гісторыі і гістарыяграфіі Заходняй Беларусі.

Складаны генезіс іх навуковых кантактаў выяўляецца на падставе ліста дырэктара Інстытута гісторыі партыі (ІГП) Н.В. Каменскай у ідэалагічны аддзел ЦК КПБ. Туды раней са скаргай звярнулася Т.Ю. Глінская ў адказ на беспадстаўнае, як яна сцвярджа-

ла, выключэнне яе са складу аўтарскага калектыву па напісанні гісторыі КПЗБ пад кіраўніцтвам М.С. Арэхвы. Праца над названай тэмай у ІГП пачалася ў 1960 г. З гэтага часу ў складзе калектыву ў якасці пазаштатнага аўтара адной з глаў кафедрай гісторыі КПСС БДУ была рэкамендавана аспірантка Т.Ю. Глінская, якая ў 1963 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю па гісторыі КПЗБ. Па плане ІГП, рукапіс главы Глінская павінна была прадставіць да снежня 1963 г., аднак за гэты час «она не написала ни единой строчки по числившейся за ней II главе названной коллективной монографии». У сярэдзіне снежня 1963 г. кіраўнік аўтарскага калектыву М.С. Арэхва азнаёміўся з тэкстам кандыдацкай дысертацыі, якую Т.Ю. Глінская разлічвала прадставіць як свой тэкст у калектыўнае выданне, выказаў шэраг заўваг, выпраўленне якіх дало б магчымасць уключыць тэкст у запланаванае выданне. У выстаўлены тэрмін (люты 1964 г.) тэкст не быў прадстаўлены. Па просьбе аўтара Інстытут працягнуў тэрмін да 1 красавіка; у канцы красавіка Т.Ю. Глінская прадставіла стары варыянт дысертацыі. Даследчыца, даючы тлумачэнні адносна невыканання ёй патрабаванняў навуковага кіраўніка тэмы, звяртала ўвагу на тое, што яна «загружена преподавательской и общественной работой, летом едет в отпуск, приступить к написанию главы сможет только в конце 1964 г.». 7 мая 1964 г. сектар гісторыі навукі ІГП у прысутнасці Т.Ю. Глінскай абмеркаваў прадстаўлены матэрыял, прызнаўшы, што ён не можа быць асновай для II главы манаграфіі, і няма ніякай гарантыі, што Глінская зможа «доброкачественно написать главу в срок, чем ставится под угрозу срыва предусмотренный планом срок издания книги». У сувязі з гэтым 8 мая 1964 г. Т.Ю. Глінская была вызвалена ад работы ў складзе аўтарскага калектыву [19, арк. 158–159].

Што да заўваг М.С. Арэхвы, то яны ў асноўным былі абумоўлены даверам Т.Ю. Глінскай да выяўленых крыніц. Яны неадназначна адлюстроўвалі асаблівасці функцыянавання камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі, у якім праяўляліся разнастайныя плыні, што стала асновай для актыўнай фракцыйнай барацьбы ў КПЗБ.

Асаблівую цікавасць дадзенай гістарыяграфічнай сітуацыі надае тое, што станоўчую рэцэнзію на кандыдацкую дысертацыю Т.Ю. Глінскай (па прычыне гендарнай салідарнасці ці, верагодна, па просьбе нявыяўленых зацікаўленых асоб) падпісала Н.В. Каменская, дырэктар ІГП, дзе працаваў М.С. Арэхва. Як адзначае рэцэнзент, дысертацыя «является серьезным научным исследованием по истории КПЗБ середины 20-х годов». Пры гэтым на копіі рэцэнзіі чарнiламі рукой М.С. Арэхвы зроблена прыпіска: «Эта рецензия по поручению директора института писана мною» [19, арк. 151–155]. Дваістасць пазіцыі М.С. Арэхвы выяўляецца ў лісце да загадчыка аддзела сацыяльна-эканамічнай літаратуры выдавецтва «Беларусь» Садоўскага ад 22 кастрычніка 1964 г., у якім дысертацыя ацэнена як «весьма посредственная, недоработанная и содержит много неправильных положений и даже ошибочных формулировок», ён жа, «не желая задержки научного роста и думая, что она честно пойдет в науку, сделал снисхождение и дал в общем положительный отзыв на ее диссертацию» [19, арк. 160–162].

М. Арэхва сам паставіў сябе ў неадназначнае становішча, а Т.Ю. Глінская, нягледзячы на адпаведныя захады з боку «нядобразычліўцаў», працягвала весці справу да выдання сваёй манаграфіі, таму 3 снежня 1964 г. М.С. Арэхва звярнуўся да першага сакратара ЦК КПБ К.Ц. Мазурава. Вучоны паведамляў пра тое, што ў выдавецтве «Беларусь» у 1965 г. прадугледжана выданне кнігі Т.Ю. Глінскай, павярхоўнай і недапрацаванай, з памылковымі палажэннямі і фармулёўкамі, «могущими внести лишь путаницу в правдивое освещение истории КПЗБ». Але найбольш уразіла М.С. Арэхву тое, што «издание кандидатской диссертации т. Глинской в качестве самостоятельной монографии нашло поддержку в идеологическом отделе ЦК КПБ» [19, арк. 164–165].

Аднак, нягледзячы на свой аўтарытэт у партыйных колах, які М.С. Арэхва ўзмацняў прыпіскай у лістах пра сябе як пра «бывшего члена центрального руководст-

ва КПЗБ», яго звароты не атрымлівалі жаданай рэакцыі, а, наадварот, сталі ўспрымацца як надуманыя прэтэнзіі. Красамоўнай ілюстрацыяй гэтага з'яўляецца разбіральніцтва па пытанні выхаду манаграфіі Т.Ю. Глінскай на ўзроўні ЦК КПБ. У канцы лютага 1965 г. у адказ на зварот М.С. Арэхвы да К.Ц. Мазурава была праведзена нарада з за-прашэннем зацікаўленых асоб. Супрацоўнік апарату ЦК КПБ Матузаў адхіліў М.С. Арэхву ад удзелу ў нарадзе, на якой заўвагі ў дачыненнні да працы Т.Ю. Глінскай былі прызнаны неістотнымі, і кніга пайшла ў друк [10].

Відавочна, што пашыраць крытычны фон навокал Т.Ю. Глінскай, якая мела кандыдацкую ступень і навуковыя публікацыі ў партыйным друку, азначала ставіць пад сумнеў сістэму арганізацыі савецкай гістарычнай навукі. У сярэдзіне 1960-х гг. у навуковай і партыйна-ідэалагічнай сферы аўтарытэт і статус М.С. Арэхвы і гісторыі КПЗБ як недатыкальных быў больш сціплым, чым на хвалі рэабілітацыі КПЗБ у другой палове 1950-х гг.: з цягам часу актуальнасць гісторыка-партыйнай тэматыкі КПЗБ паступова стала губляць прывабнасць у асяродку партыйна-дзяржаўных структур. У сувязі з відавочным ігнараваннем меркаванняў М.С. Арэхвы, выказаных ім у рэцэнзіях, лістах і зваротах у высокія інстанцыі, адносна выяўленых ім недахопаў у асвятленні гісторыі КПЗБ, ім разам з ветэранамі КПЗБ І.Ф. Сяменікавым і Л.Д. Шайкоўскім быў выдадзены артыкул «За правільнае асвятленне гісторыі КПЗБ», у якім на прыкладзе кнігі Т.Ю. Глінскай былі праілюстраваны недахопы ў вывучэнні дзейнасці кампартыі [20].

Крытычна адрэагавала на кнігу Т.Ю. Глінскай і польская даследчыца А.Р. Бергман, ветэран КПЗБ, аўтарытэтны даследчык гісторыі Заходняй Беларусі [21]. М.С. Арэхва настойліва звяртаўся і да В.П. Ласковіча, ветэрана КПЗБ, з тым, каб той размясціў крытычную рэцэнзію на кнігу Т.Ю. Глінскай у брэсцкіх газетах [22, арк. 41, 49, 66]. Відавочна, пад уплывам М.С. Арэхвы адмоўныя адносіны да Т.Ю. Глінскай сфарміраваліся і ў Б.С. Клейна, які атрымліваў ад яго парады і падтрымку [23, арк. 42–44]. Б.С. Клейн у лісце дзяліўся з М.С. Арэхвам сваімі крытычнымі заўвагамі да манаграфіі Т.Ю. Глінскай, канстатаваў рэгрэс прафесійнага ўзроўню аўтара выдання, выказаў здзіўленне асабістай смеласцю Т.Ю. Глінскай, якая, нягледзячы на катэгарычнае супрацьдзеянне М.С. Арэхвы, усё ж выдала сваю манаграфію: «Кстати, кто она такая, где работает и почему имеет "зеленую улицу" в издательстве?» [19, арк. 196–198].

Звяртаючы ўвагу на настойлівасць Т.Ю. Глінскай у рэалізацыі сваіх навуковых памкненняў, на падтрымку яе з боку ідэалагічных структур ЦК КПБ, адзначым слабае выяўленне ў навукова-гістарычным асяродку таго часу гендарнай салідарнасці. Названыя вышэй А.Р. Бергман, даючы адмоўную рэцэнзію, і Н.В. Каменская, выдаляючы Т.Ю. Глінскую з аўтарскага калектыву, палічылі патрэбным дбаць пра навукова-вытворчыя патрэбы, ігнаруючы пры гэтым гендарныя асаблівасці адпаведнай гістарыяграфічнай сітуацыі. З другога боку, адзначым, што ўзгаданая нябачная падтрымка Т.Ю. Глінскай і «зялёная вуліца» зусім верагодна магла стаць вынікам рэалізацыі яе паказчыкаў гендарнага характару як жанчыны, маці, сяброўкі і г.д.

На жаль, ва ўмовах адсутнасці крыніц, якія маглі б праілюстраваць гендарнае значэнне, паказчыкі ўзаемаадносін у навукова-гістарычнай супольнасці даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі міжваеннага часу, такога характару інфармацыя адносна прафесійна-асабістых узаемаадносін з'яўляецца толькі падставай для тэарэтычнага мадэлявання, якое патрабуе пацвярджэння дакументальнымі крыніцамі.

**Заключэнне**

Такім чынам, прысутнасць жанчын у дысцыплінарнай навуковай супольнасці даследчыкаў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., якая стала вынікам іх паспяховай навуковай самарэалізацыі, была істотнай, аднак далёка не парытэтнай у параўнанні з мужчынскай часткай дадзенай групоўкі. У змястоўна-канцэптуальным плане дасле-

даванні гісторыкаў-жанчын не змаглі аформіць «жаночай» версіі адпаведных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах жорсткага кантролю за навуковымі даследаваннямі з мэтай забеспячэння аднастайнасці і тоеснасці выпрацаваным партыйна-дзяржаўнымі інстанцыямі схемам. У сваім прафесійным станаўленні жанчыны мелі як цяжкасці, абумоўленыя іх традыцыйнымі сацыяльнымі ролямі, так і спагадлівае стаўленне з боку калег і кіраўніцтва. Аднак для стварэння больш дасканалай сістэмнай карціны навукова-гендарных аспектаў гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі патрабуецца далейшая актывізацыя архіўна-пошукавай дзейнасці, падрыхтоўка і апублікаванне эгадакументальных крыніц айчынных гісторыкаў, у якіх атрымаюць істотнае адлюстраванне і гендарныя паказчыкі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Астрога, В. А. Даследаванне новай і навейшай гісторыі замежных краін на Беларусі ў міжваенны перыяд (1921–1941 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02, 07.00.03 / В. А. Астрога. – Мінск, 1996. – 208 арк.

2. Докторские и кандидатские диссертации по историческим наукам БССР. 1944–1987 гг. : библиогр. указ. / сост.: В. Н. Михнюк, Л. Н. Новицкая. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск, 1988. – 126 с.

3. Царюк, И. О. Деятельность Компартии Белоруссии по осуществлению культурной революции в западных областях республики (1939–1953 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / И. О. Царюк ; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1965. – 22 с.

4. Царюк, И. О. Деятельность КПБ по осуществлению преобразований и организации социалистического строительства в западных областях Белоруссии (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.) : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.01 / И. О. Царюк ; Белорус. гос. ун-т им. В. И. Ленина. – Минск, 1975. – 49 с.

5. Царюк, И. О. В семье единой: к 30-летию со дня воссоединения Западной Белоруссии и БССР / И. О. Царюк. – Минск : Беларусь, 1969. – 110 с.

6. Царюк, И. О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях Белоруссии: 1939–1955 гг. / И. О. Царюк. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1969. – 198 с.

7. Царюк, И. О. В братском союзе: социалистические преобразования экономики в западных областях БССР, сентябрь 1939 – июнь 1941 гг. / И. О. Царюк. – Минск : Изд-во БГУ, 1976. – 103 с.

8. Глинская, Т. Ю. КПЗБ во главе революционно освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии в период частичной относительной стабилизации капитализма (1924–1928 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Т. Ю. Глинская ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1963. – 19 с.

9. Глинская, Т. Ю. КПЗБ в борьбе за завоевание трудящихся масс (1924–1928 гг.) / Т. Ю. Глинская. – Минск, 1962. – 65 с.

10. Глинская, Т. Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924–1928 гг. / Т. Ю. Глинская. – Минск : Беларусь, 1965. – 200 с.

11. Наркевич, С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. экон. наук / С. И. Наркевич ; Акад. наук БССР. – Минск, 1965. – 20 с.

12. Наркевич, С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : дис. … канд. экон. наук / С. И. Наркевич. – Минск, 1965. – 209 л.

13. Талапина, С. В. Вера Хоружая – революционер-публицист : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.10 / С. В. Талапина ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1975. – 27 с.

14. Талапина, С. В. Вера Хоружая – революционер, публицист / С. В. Талапина. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1973. – 95 с.

15. Гойдь, Т. А. Деятельность КПЗБ по руководству МОПРом (Международной организацией помощи борцам революции) в Западной Белоруссии в 1923–1939 гг. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.01 / Т. А. Гойдь ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1981. – 22 с.

16. Лугачева, Т. А. Международная организация помощи революционерам (МОПР) в Западной Беларуси (1923–1939 гг.) / Т. А. Лугачева. – Гродно : ГрГУ, 2001. – 114 с.

17. Царюк, И. От родного порога / И. Царюк. – Минск, 2011. – 167 с.

18. Царюк, И. О. Крутые дороги : Сергею Притыцкому посвящается / И. О. Царюк. – Минск : Рифтур, 2012. – 255 с.

19. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1100.

20. Орехво, Н. Недостатки одного издания / Н. Орехво, И. Семеников, Л. Шайковский // Коммунист Белоруссии. – 1966. – № 6. – С. 74–75.

21. Bergman, А. Глинская, Т. Ю. КПЗБ – руководитель освободительной борьбы трудящихся Западной Белоруссии. 1924–1928 гг. / A. Bergman // Z Pola Walki. – 1966. – № 4 (36). – S. 174–177.

22. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 500. Воп. 1. Спр. 79.

23. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1103.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 14.11.2018

***Savich A.A.*** **Gender Aspects of the Domestic Historiography of the History of Western Belarus 1921–1939**

*The study is aimed at understanding the gender indicators of the national historiography of the history of Western Belarus in 1921–1939 in the second half of the 1950s–1980s. The complexity of understanding the topic is a small number of ego-documentary sources of the scientific and historical society of researchers in the history of Western Belarus, a small presentation of gender issues in archival collections. Despite this, on the basis of various sources, both published scientific works, abstracts, and manuscripts of dissertations, as well as archival materials, the author has revealed the importance of the professional participation of women historians in the development of Western Belarusian historiography. There is a rather high degree of presence of women in the scientific community of researchers of Western Belarusian history, their high scientific success and publishing effectiveness. However, in the context of the Soviet unification of historical research, female historians did not have the opportunity to create a «feminine» line of relevant problems.*